Зміцер Сасноўскі

# Музычная культура рыцарскага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага

Мінск, «Кнігазбор», 2010

www.kamunikat.org

УДК 78.03(476)
ББК 85.31(4Беи)
С12

Аўтар выказвае шчырую падзяку
Польскаму Інстытуту ў Мінску
за падтрымку ў выданні кнігі

**Сасноўскі, З.**
С12 Музычная культура рыцарскага саслоўя Вялікага Княства Літоўскага і Каралеўства Польскага / Зміцер Сасноўскі. — Мінск : Кнігазбор, 2010. — 136 с.
ISBN 978-985-6976-52-3.

**УДК 78.03(476)**
**ББК 85.31(4Беи)**

**ISBN 978-985-6976-52-3**

© Сасноўскі З., 2010
© Афармленне. ПУП «Кнігазбор», 2010

www.kamunikat.org

# Прадмова

Падрыхтоўка рыцара абавязкова ўключала засваенне комплексу сігналаў, неабходных для вайсковага побыту, вартавой службы і арганізаванага ўдзелу ў бітвах. У «Слове пра паход Ігаравы» пра жыццё сапраўднага ваяра сказана, што ён народжаны пад вайсковымі трубамі: «под трубами повиты, под шлемами взлелеяны, с копья вскормлены» [7].

Пра каштоўнасць вайсковых музыкаў сведчыць тое, што пры абмене ваеннапалоннымі музыкаў залічвалі да афіцэраў. Нездарма Ф. Скарына ў прадмове да «Кнігі 2-га закону Маісеева» апісаў важнасць разумення рыцарамі сігналаў труб: «Некое же право — рицерское или военное, еже на войне соблюдаемо бываеть, яко справовати полки, знати своя места, розумети глас труб…» [там жа].

Музыкі былі важнай часткай вайсковай інфраструктуры, без іх войска было некіруемым. На барабанах, трубах, рагах, горнах, званах выконваўся ўвесь комплекс вайсковых сігналаў: вартавыя, баявыя (трывога, атака, адыход), маршавыя і парадныя. Музычныя сігналы служылі сродкам інфармацыі ў ваенным побыце: пад'ём, адбой, абед, пачатак малітвы і інш. Да рыцарскай музычнай культуры аднясем таксама і музыку шляхецкага асяроддзя, якая гучала ў мірны міжваенны час.

Храналагічны перыяд, якому прысвечана гэтая праца, абмяжоўваецца часам утварэння Вялікага Княства Літоўскага — XIII ст. — і часам знішчэння «Рэчы Паспалітай абодвух народаў» — канцом XVIII ст., калі Рэч Паспалітая была знішчана ўзаемным нападам Аўстрыі, Прусіі і Расіі.

У кожнай з прапанаваных у гэтым выданні ілюстрацый закладзены аўтарскі погляд на першапачатковы матэрыял, камп'ютарная апрацоўка ўсіх выяў выканана аўтарам. Таму пры выкарыстанні ў іншых выданнях іканаграфіі з гэтай кнігі неабходна спасылка на крыніцу і аўтара.

Аўтар выказвае шчырую падзяку Польскаму Інстытуту ў Мінску за падтрымку ў выданні кнігі.